**Даведка**
**аб дзейнасці гісторыка-краязнаўчага народнага музея**
**дзяржаўнай установы адукацыі**
**“Бердаўская базавая школа Лідскага раёна” Гродзенскай вобласці**

Гісторыка-краязнаўчы народны музей дзяржаўнай установы адукацыі “Бердаўская базавая школа Лідскага раёна” (далей – музей) быў заснаваны як гісторыка-краязнаўчы музей у чэрвені 1989 г. З’яўляецца структурным падраздзяленнем Бердаўскай базавай школы Лідскага раёна, дзейнічае на падставе падставе загада дырэктара школы № 41 ад 26 чэрвеня 1989 г.

17 чэрвеня 2005 г. Пастановай калегіі ўпраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама музею прысвоена званне “народны”. Гэта званне пацвержана двойчы: рашэннем калегіі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь ад 20 чэрвеня 2011 г. за № 87 і ад 6 лютага 2018 г. за № 2.

Музей – здабытак, бясцэнны для гісторыі і для нашчадкаў. Ён захоўвае прадметы даўніны дзеля будучых пакаленняў, стварае ўмовы для іх папулярызацыі, прыцягнення як мага большай колькасці наведвальнікаў, выхоўвае і пашырае веды вучняў па вучэбных прадметах.

Мэта музея – абуджэнне і ўзмацненне цікавасці вучняў да гісторыі свайго краю, вёскі, школы, захаванне інфармацыі пра гістарычныя падзеі малой Радзімы, удзельнікамі якіх сталі звычайныя людзі.

Асноўныя задачы музея:

- займацца зборам, вывучэннем, захаваннем і паказам прадметаў і дакументаў, якія характарызуюць развіццё прыроды і чалавечага грамадства і ўяўляюць гістарычную, навуковую ці мастацкую каштоўнасць;
- вывучаць і асэнсоўваць мясцовую гісторыю і культуру ў кантэксце айчыннай у мэтах развіцця інтэлектуальных, маральных, культурных і творчых магчымасцей вучняў, выхавання ў іх нацыянальнай самасвядомасці, далучэння да нацыянальнай і агульначалавечай культуры;
- засвойваць найбольш рацыянальныя метады і прыёмы музейнай педагогікі, укараняць іх у адукацыйную дзейнасць у рабоце з выхаванцамі дзіцячага сада і вучнямі ўсіх ступеней агульнай сярэдняй адукацыі;
- ахоўваць і прапагандаваць помнікі гісторыі, культуры, прыроды роднага краю;
- праводзіць культурна-асветніцкую работу сярод выхаванцаў і вучняў, іх законных прадстаўнікоў і іншага мясцовага насельніцтва.

Экспазіцыя музея знаходзіцца ў асобным будынку. У шасці экспазіцыйных залах музея (плошча 145 м кв.) і фондасховішчы (плошча 8 м кв.) на 01.02.2023 г. захоўваецца 3196 музейных прадметаў асноўнага і дапаможнага фонду, многія з гэтых прадметаў уяўляюць гістарычную, прыродазнаўчую і навуковую каштоўнасць. 9 прадметаў фонда ўключаны ў Музейны фонд Рэспублікі Беларусь. За апошнія тры гады, з 01.01.2020 па 31.12.2022, музей наведалі 5698 экскурсантаў.

На бягучы момант у музеі налічваецца 10 экспазіцыйных раздзелаў:

1. Жыццё і побыт беларускага селяніна ў канцы ХІХ-пачатку ХХ ст. Экспазіцыя адносіцца да ансамблевых. У ёй узнаўляюцца на прадметнай аснове абставіны, звязаныя з побытам нашага народа.

У трох пакоях музея створаны інтэр'ер сялянскай хаты: жылы пакой ("святліца"), кухня ("бабін кут"), камора. Сабраны прадметы і прылады працы, мэбля, посуд, адзенне, абутак і г.д.

2. "З чаго ўсё пачыналася" (Лідчына ў старажытныя часы). Экспазіцыя абноўлена падчас апошняй рэканструкцыі (2015 г.) і папаўняецца. Гэта экспазіцыя падпарадкавана храналагічнаму прынцыпу і адлюстроўваецца ў дыялектычным развіцці. У ёй экспазіцыйныя комплексы аб'яднаныя ў тэмы і раздзелы.

Тут размешчаны разнастайныя макеты: здабыча крэменю, зерняцёрка, паселішча ранняга жалезнага веку, прыстасаванне для свідравання адтулін у камені; калекцыя археалагічных знаходак (крамянёвыя прылады працы, кераміка неманскай культуры, якія дэманструюцца ў адпаведнасці з навуковай сістэматыкай, прынятай у археалогіі), фотаздымкі месцаў стаянак першабытных людзей, малюнкі з жыцця і дзейнасці першабытнага чалавека.

3. Наш край у ІХ-ХVІІІ стст. (гісторыя Лідчыны ад часоў Полацкага княства да падзелаў Рэчы Паспалітай). Экспазіцыя папаўняецца інфармацыйна з улікам апошніх даследаванняў і сучасных магчымасцяў. Тут захоўваюцца і ўзнаўляюцца на дакументальнай падставе абставіны, звязаныя з гістарычнымі падзеямі, культурай, дзейнасцю выдатнай асобы. Размешчаны партрэты-рэпрадукцыі гістарычных асоб названага перыяду, карты дзяржаўных утварэнняў (Полацкага, Тураўскага, Навагрудскага княстваў, ВКЛ, Рэчы Паспалітай); макеты (Лідскі замак перыяду ХVІ ст., бамбарды, зброя касінера); рамесныя вырабы (замок, цвік, нажніцы, сякера, нож); матэрыялы пошукавай работы, паходаў па месцах паўстанцаў пад кіраўніцтвам Тадэвуша Касцюшкі. У экспазіцыі размешчана літаратура, якая адлюстроўвае гістарычныя падзеі адзначанага перыяду.

4. Маёнтак "Бердаўка". Экспазіцыя створана падчас рэканструкцыі музея ў 2015 г. і на бягучы момант папаўняецца за кошт пошукавай дзейнасці. У экспазіцыі захоўваюцца і ўзнаўляюцца на дакументальнай падставе абставіны, звязаныя з гістарычнымі падзеямі, дзейнасцю выдатнай асобы.

Змястоўныя фота і дакументальныя матэрыялы, рэчавыя і пісьмовыя гістарычныя крыніцы апавядаюць пра гісторыю ўзнікнення Бердаўкі, пра гісторыю маёнтка і яго гаспадароў. Багаты матэрыял сабраны пра апошняга ўладальніка маёнтка "Бердаўка" Дамбавецкага А.С. (дакументы, публікацыі, ксеракопіі архіўных матэрыялаў, узнагарод, тытульнага ліста кнігі "Вопыт апісання Магілёўскай губерні..." з аўтографам Дамбавецкага А.С., які з'яўляўся рэдактарам дадзенага выдання; прадметы ХІХ-пачатку ХХ стст. – цэгла з кляймом бердаўскай цагельні, чарапіца з завода Брахоцкага з вёскі Морына, купчая на зямлю і інш.) Сабрана і аформлена для экспанавання сувенірная калекцыя ордэнаў Расійскай імперыі.

5. Бердаўка ў 1920-1930-я гг. (створана ў 2015 г. і папаўняецца). У экспазіцыі ўзнаўляюцца на дакументальнай падставе абставіны, звязаныя з

гістарычнымі падзеямі 1914-1939 гг. Тут знаходзіцца матэрыял, які апавядае пра гісторыю Першай сусветнай вайны ў нашым краі, знаходжанне Бердаўкі ў складзе Польшчы. Прадстаўлены фотаздымкі, звязаныя з бердаўскім конезаводам, Школай ральнічай, першым бердаўскім касцёлам (знішчаны), фотаздымкі ўладальніка былога фальварка “Ільянова” Вітольда Радкевіча і яго сям’і. Дакументы і кнігі распавядаюць пра сацыяльна-эканамічнае становішча Бердаўкі ў гэты перыяд айчыннай гісторыі.

6. “Каб памяталі пра вайну” (абноўлена падчас рэканструкцыі 2015 г. і папаўняецца). У экспазіцыі захоўваюцца і ўзнаўляюцца на дакументальнай падставе абставіны, звязаныя з гістарычнымі падзеямі Вялікай Айчыннай і Другой сусветнай войнаў. Дакументы, фотаздымкі, лісты з фронту, архіўныя матэрыялы, узнагароды расказваюць аб ураджэнцах Бердаўскага сельскага савета, удзельніках Вялікай Айчыннай вайны і еўрапейскага супраціўлення, тут сабраны рэшткі зброі і рыштунку ваенных часоў, матэрыялы пошукавай работы. Вядзецца падрыхтоўка да адкрыцця пастаяннай экспазіцыі “Без тэрміну даўніны: трагедыя мірнага насельніцтва лідскай зямлі” (генацыд беларускага народа ў час Вялікай Айчыннай вайны 1941-1945 гг.). Ужо праведзена даследаванне і сабраны матэрыялы па тэме беларускага остарбайтарства. На этапе сістэматызацыі матэрыялы даследавання, прысвечанага спаленым вёскам Лідскага раёна, у прыватнасці, вёскі Татарцы Бердаўскага с/с.

7. “Агеньчык яе будзе вечна гарэць!..”(З гісторыі школы). Экспазіцыя была абноўлена падчас рэканструкцыі 2015 г. і папаўняецца. Адносіцца да ансамблевай экспазіцыі, у якой захоўваюцца ці ўзнаўляюцца на дакументальнай падставе абставіны, звязаныя як з гістарычнымі падзеямі, так і з культурай, з дзейнасцю кіраўнікоў установы адукацыі. У Год гістырычнай памяці ў маі 2022 года зала папоўнілася новай экспазіцыйнай часткай “Адданыя роднай зямлі…”. Яна прысвечана памяці выдатніка адукацыі Рэспублікі Беларусь Крупы Анатоля Леанідавіча (1955-2020), настаўніка гісторыі і грамадазнаўства, дырэктара Бердаўскай школы (з 1984 па 2018), заснавальніка нашага музея, і яго жонкі Крупы Наталлі Фёдараўны (1961-2021), настаўніка рускай мовы і літаратуры, якія аддалі ўстанове адукацыі каля 35 год кожны. Сабраныя інфармацыя, фотаматэрыялы, дакументы, узнагародныя лісты і ўласныя рэчы дазваляюць пазнаёміцца з працоўнай біяграфіяй і фактамі асабістага жыцця людзей, цалкам прасякнутых любоўю да педагогікі і бердаўскай зямлі і аддадзеных ім.

У экспазіцыі “Агеньчык яе будзе вечна гарэць!..” таксама прадстаўлены матэрыялы пра кіраўнікоў і настаўнікаў школы, пра вядомых выпускнікоў, фотаздымкі, узнагароды, падручнікі, вучнёўскія прылады, школьная форма і да т.п.

8. “Жыццё прысвяцілі, вёска, табе…” (створана ў 2015 г. і папаўняецца). Тут сабраны матэрыялы пра работнікаў сельскай гаспадаркі, культуры, медыцыны, кіраўнікоў сельскага Савета, экспануюцца фотаздымкі, граматы, бытавая тэхніка, прыборы і іншыя рэчы перыяду 1960-1980-х гг.

9. “Ён пабудаваў сабе помнік” (Жыццё і дзейнасць Аляксандра Аляксандравіча Каранюка). Экспазіцыя створана падчас рэканструкцыі музея 2015 г. і папаўняецца. Сабраны матэрыялы пра развіццё калгасаў у Бердаўскім сельскім савеце з 1940 г., матэрыялы пра працоўны подзвіг Каранюка А.А. і калектыву калгаса “Бердаўка”, які ён узначальваў на працягу 29 гадоў; пасведчанні, дакументы, урадавыя ўзнагароды (ордэны Чырвонага Працоўнага Сцяга, Кастрычніцкай эвалюцыі, “Знак Пашаны”, медалі, граматы), асабістыя рэчы, фотаздымкі. Таксама ў дадзеным раздзеле экспануюцца прадметы побыту савецкага перыяду (тагачасная тэле- і радыёапаратура, вінілавыя пласцінкі, тэхнічныя і электрапрыборы, сувенірная прадукцыя і г.д.).

10. Флора і фаўна нашага краю (абноўлена ў 2015 г.). Тут знаходзяцца пудзілы дзікіх звяроў: мядзведзя, аленя, дзіка; птушак (лебедзя-шыпуна, чаплі, качкі, вароны, сарокі, грака, савы, шпака); птушыныя гнёзды, муляжы грыбоў, мох, камяні.

Дзейнасць школьнага музея заснавана на прынцыпах, якія вызначаюць як яго адметнасць, так і асноўныя накірункі дзейнасці:

- сістэматычная сувязь з адукацыйным працэсам;
- апора на самастойнасць і творчую ініцыятыву школьнікаў;
- дакладны ўлік, правільнае захоўванне і экспанаванне сабраных матэрыялаў;
- правядзенне навуковага-даследчага пошуку;
- падтрыманне пастаяннай сувязі з грамадскімі арганізацыямі, з іншымі педагагічнымі калектывамі і музеямі ўстаноў адукацыі раёна, з ветэранамі працы;
- выкарыстанне ў адукацыйным працэсе разнастайных прыёмаў і формаў музейнай педагогікі (музейных урокаў, школьных лекцый, семінараў, навукова-практычных канферэнцый, пошукавай і праектнай работы, правядзенне выстаў, экскурсій, у тым ліку і інтэрактыўных, і інш.).

Гэтыя прынцыпы забяспечваюць максімальнае збліжэнне адукацыйнага працэсу з “жывымі” прадметамі культурнага багацця народа, фактамі гісторыі, стымулюючы адначасова актыўную пазнавальную дзейнасць вучняў. Уся дзейнасць музея скіравана на выхаванне пачуцця адказнасці за захаванне культурных і прыродных багаццяў свайго краю, гонару за сваю Бацькаўшчыну.

Педагагічнае кіраўніцтва работай актыву музея на працягу 18 гадоў (з 2002 па 2020 гг.) ажыццяўляў Крупа Анатоль Леанідавіч, які перадаваў свой вопыт калегам, вучням і выхаванцам установы адукацыі, вучыў арганізацыйнаму майстэрству, дапамагаў лектарам і экскурсаводам у распрацоўцы і правядзенні лекцый, экскурсій, арганізацыі масавых мерапрыемстваў, афармленні экспазіцый музея. З 2021 года (загад № 53.1 ад 01.03.2021) адказнымі за работу школьнага музея прызначаны настаўнік гісторыі, грамадазнаўства і геаграфіі Арлоўскі Аляксандр Генадзьевіч і настаўнік беларускай мовы і літаратуры Альшэўская Галіна Антонаўна.

Названыя педагогі падхапілі пачатую справу свайго папярэдніка, каб захаваць і памножыць традыцыі, закладзеныя і развітыя Анатолем Леанідавічам.

У арганізацыі работы музея актыўны ўдзел прымаюць вучні Бердаўскай базавай школы. Асноўная частка працы ажыццяўляецца актывам. Але да музейнай дзейнасці абавязкова прыцягваюцца іншыя вучні, якія не ўваходзяць у яго лік.

Работу музея арганізуе Савет з пяці сектараў: пошукавага, перапіскі, экскурсійнага, фондавага, афармiцельскага. У склад Савета музея ўваходзяць як вучні, так і настаўнікі, і ўсе яны аб'яднаны ў краязнаўча-патрыятычны клуб "Спадчына". Савет музея адносна не вялікі, што дазваляе ім лёгка кіраваць, аператыўна разглядаць тыя ці іншыя пытанні. У Савеце музея адказнасць за асобныя накірункі дзейнасці размеркавана паміж педагагічнымі работнікамі ўстановы адукацыі.

Сектар пошукавай працы займаецца камплектаваннем фондаў, распрацоўкай маршрутаў вандровак і экспедыцый, арганізацыяй заняткаў па вывучэнні методыкі выяўлення і збору помнікаў гісторыі, культуры, прыроды, апісаннем і афармленнем сабранага, запісам успамінаў, апавяданняў і г.д.

Сектар перапіскі наладжвае і вядзе перапіску з установамі адукацыі і культуры, арганізацыямі, музеямі іншых устаноў адукацыі, выпускнікамі школы, з цікавымі людзьмі і інш.

Фондавы сектар адказны за ўнутрымузейны ўлік фондаў, арганізуе захаванне помнікаў гісторыі, культуры, прыроды, кантроль за рэжымамі захоўвання.

Сектар экскурсійнай работы распрацоўвае і праводзіць агляды, тэматычныя экскурсіі, вучэбныя экскурсіі ў межах прадметных вучэбых праграм.

Афармiцельскі сектар распрацоўвае канцэпцыю новых экспазіцый і стварае іх – адбірае экспанаты, рыхтуе этыкетаж, займаецца мантажом музейных экспазіцый і выстаў, афармляе іх.

Савет музея надае вялікую ўвагу падрыхтоўцы юных экскурсаводаў. Педагогі разам з экскурсаводамі адбіраюць і абмяркоўваюць матэрыялы традыцыйных і інтэрактыўных экскурсій, афармляюць "партфель экскурсавода".

Штогадова для вучняў II ступені агульнай сярэдняй адукацыі, якія імкнуцца лепш ведаць свой край і атрымаць пачатковыя навыкі экскурсавода, арганізуецца дзейнасць заняткаў па інтарэсах "Юныя экскурсаводы" і "Музеязнаўства" Іх удзельнікі вучацца самастойна праводзіць экскурсіі розных тыпаў і відаў, што садзейнічае развіццю творчых і камунікатыўных навыкаў, удзельнічаюць у стварэнні такіх экскурсій.

Акрамя правядзення экскурсій, гуртkоўцы і юныя экскурсаводы прыцягваюцца да лектарскай працы. Перад правядзеннем лекцый праводзяцца спецыяльныя заняткі па выпрацоўцы лектарскіх навыкаў. Тэмы лекцый выбіраюцца сумесна з кіраўніком музея і адпавядаюць якім-небудзь значным падзеям, датам або імёнам у гісторыі мясцовасці і краіны ("Памяць

аб гераічным мінулым – наш абавязак клопат”, “Героі – нашы землякі”, “Гісторыя дзіцячых і моладзевых арганізацый”, “Ветэран педагагічнай працы жыве побач”, «Летапіс школы: знакавыя падзеі», “Летапіс школы: выпускнікі з ўнікальнай прафісіяй” і інш.

У межах рэспубліканскай акцыі “Я гэты край Радзімаю заву”, Усебеларускай маладзёжнай экспедыцыі «Маршрутамі памяці. Маршрутамі адзінства» і іншых Савет музея сумесна з сябрамі патрыятычна-краязнаўчага клуба “Спадчына” праводзіць вялікую пошукава-даследчую і асветніцкую дзейнасць. У перыяд з 2020 па 2022 гг. юныя краязнаўцы з педагогамі вывучалі дакументы, матэрыялы дзяржаўных, прыватных архіваў, навукова-дакументальную, гістарычную літаратуру, адкрытыя інтэрнэткрыніцы з мэтай вывучэння гісторыі родных мясцін. У канікулярны час ладзіліся веласіпедныя і пешыя паходы і вандроўкі, у пазаўрочны – паходы выхаднога дня па населеных пунктах Бердаўскага, Дубровенскага, Ёдкаўскага і Ліпнішскага і інш. сельсаветаў Лідскага і Іўеўскага раёнаў. Былі арганізаваныя паходы “Бердаўка – Ліда – Ваверка – Красноўцы – Леснікі –Бердаўка”, для вучняў II ступені прыцягальныя паходы выхаднога дня (па маршруце Бердаўка - Кір’янаўцы – Бердаўка “Вясёлы ўікэнд”, паездка-паход па маршруце Бердаўка – Князікоўцы – Багданава – Дзясятнікі – Багданава – Бердаўка “Наперад – у гістарычнае мінулае!”, экскурсія-паход у горад Іўе “Дзе жывуць Хадзіжа і Мустафа?” і інш.). Для вучняў III ступені арганізоўваліся паездкі выхаднога дня па маршрутах “Бердаўка – Іўе – Літоўка – Навагрудак – Бярозаўка – Бердаўка”, “Бердаўка – Іўе – Вішнева – Багданава – Крэва – Гервяты – Трабы – Бердаўка”.

Для вучняў I і II ступені агульнай сярэдняй адукацыі сустрэчы з кіраўніцтвам кіраўніцтвам Бердаўскага сельвыканкама “Беларуская вёска: учора і сёння”, з Парфенчыкам А.Г. кіраўніком Музея сям’і і кіраўніком Бердаўскага культурна-дасугавага цэнтра (тэмы сустрэч “Дамбавецкі А.С. і яго бердаўская спадчына”, “Так выглядала наша вёска 50 год таму…”, “Пейзажны парк: што гэта такое”, “Мясцовыя абрадавыя традыцыі ў Музеі сям’і”).

У справаздачны перыяд адбыліся сустрэчы са знакамітымі людзьмі: беларускім паэтам Леанідам Дранько-Майсюком, супрацоўнікам Лідскага гісторыка-мастацкага музея лідскім паэтам Алесем Хітруном, намеснікам дырэктара па ідэалагічнай рабоце Лідскага лясгаса Барко Ч. М., I-ым сакратаром Лідскага раённага камітэта ГА “БРСМ” Міхаловіч В. У., II-ім сакратаром Лідскага раённага камітэта ГА “БРСМ” Яфрэмавай Т.В. воінамі-інтэрнацыяналістамі Юрыем Ганевічам, капітанам у адстаўцы Сяргеем Саханем, святаром прыхода царквы Пакрова Найсвяцейшай Багародзіцы вёскі Вялікія Князікоўцы айцом Аляксандрам Зберыноўскім. Практыкуюцца сустрэчы з былымі выпускнікамі Бердаўскай СШ, якія ў свой час таксама былі школьнымі экскурсаводамі, з’яўляліся актыўнымі краязнаўцамі і сябрамі клуба “Спадчына” – Юліяй Ёрш (Крупа), ксяндзом Антоніем (Антонам Грэмзам), Мікалаем Каламійцам.

Дзякуючы гэтаму ў музей паступілі і працягваюць паступаць дакументальныя матэрыялы. Так, напрыклад, экспазіцыя “Каб памяталі пра вайну...” папоўнілася макетам танка адной з дывізій другога корпуса генерала Андэрса і зямлёй з-пад Монтэ-Касіна, дзе змагаўся з нямецкімі захопнікамі ураджэнец бердаўскай зямлі Сухойда І.С. Экспанаты перадаў музею яго ўнук Сухойда В. І. Экспазіцыя “Маёнтак «Бердаўка»” папоўнілася самаробным макетам палаца Дамбавецкага (сучасны выгляд). Макет вырабіў Каламіец М.П. разам са сваімі вучнямі. А для стварэння экспазіцыі “Адданыя роднай зямлі…” дачка Крупы А. Л. і Крупы Н. Ф. перадала дакументы, узнагароды, асабістыя рэчы сваіх бацькоў (96 экспанатаў).

Юныя краязнаўцы здзяйсняюць этнаграфічныя вандроўкі, падчас якіх знаёмяцца з забудовай заходнебеларускай, савецкай і сучаснай вёскі, народнымі промысламі, абрадамі і звычаямі, запісваюць легенды і паданні, прымаўкі і прыказкі. Праводзяцца краязнаўчыя чытанні, прысвечаныя важным датам айчыннай гісторыі: 105-годдзю пачатку Першай Сусветнай вайны, 75-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, 75-годдзю з Дня Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне, 75-годдзю пачатку Вялікай Айчыннай вайны. Наведваюцца і добраўпарадкуюцца месцы пахаванняў воінаў і бязвінных ахвяр Першай і Другой Сусветнай войнаў і Вялікай Айчыннай войны. Праводзяцца экскурсіі ў Лідскі, Мірскі, Нясвіжскі і Гродзенскі замкі, на прадпрыемствы горада Ліды. Арганізуецца правядзенне рознапланавых выстаў: “Любімыя цацкі маіх бабулі і матулі (дзядулі і таты)”, “Сямейная рэліквія”, “Аб чым гавораць старыя паштоўкі”; выставы-прэзентацыі сямейных альбомаў, у якіх знайшлі адлюстраванне гісторыі сем’яў, прадстаўленыя ў фотаздымках 1950-1980-х гг., бытавых рэчаў, адзення, прадметаў хатняга ўжытку, кніг, грампласцінак, паштовак, значкоў і інш.

Праведзены экскурсіі ў горад Мінск у Музей сучаснай беларускай дзяржаўнасці, Нацыянальны мастацкі музей, Нацыянальную бібліятэку Рэспублікі Беларусь, Музей Якуба Коласа. Здзейснена пешая экскурсія па Мінску, падчас якой вучні пазнаёміліся з архітэктурай горада, наведалі дворык БДУ, плошчы Свабоды, Перамогі, Незалежнасці, Якуба Коласа, Прывакзальную, чыгуначны вакзал і г.д. Убачылі мемарыял, прысвечаны беларускім воінам-інтэрнацыяналістам “Востраў Слёз, або Востраў Мужнасці і Смутку”, мемарыял у памяць загінулых на станцыі метро “Няміга”, Чырвоны касцёл Святых Сымона і Алены, “Востраў слёз”, ГЦ “Сталіца”, Палац мастацтваў, парк Янкі Купалы.

Экскурсія ў горад Гродна дазволіла вучням пабываць на Алеі дружбы, закладзенай на XII Рэспубліканскім фестывалі нацыянальных культур, убачыць помнік гродзенскаму палкаводцу Давыду Гарадзенскаму і стэлу 850-годдзя горада Гродна ў Каложскім парку, наведаць Свята-Барыса-Глебскую (Каложскую) царкву, Гродзенскі заапарк.

Краязнаўчая работа ва ўстанове адукацыі праводзіцца на адукацыйных і факультатыўных занятках, у пазаўрочны час. Формы пазакласнай работы вельмі разнастайныя: тыдні гісторыі і краязнаўства, гістарычныя вечарыны,

алімпіяды, канферэнцыі, паходы, экскурсіі, злёты, спаборніцтвы, акцыі, вахты памяці, сустрэчы з ветэранамі і інш. Школьнікі актыўна ўдзельнічаюць у акцыях рознага ўзроўню.

Тыдні краязнаўства сталі традыцыйнымі, і ўжо больш за 10 год штогод арганізуюцца і праводзяцца Саветам музея ў красавіку. У іх плане – краязнаўчыя алімпіяды, навукова-практычныя канферэнцыі, конкурсы і віктарыны, святкаванні краязнаўчых і гістарычных юбілеяў і знамянальных дат, тэматычныя выставы (асаблівай папулярнасцю карыстаецца экспрэс-выстава “Музей у чамадане”) майстар-класы мясцовых майстроў, сустрэчы з цікавымі людьмі, інтэрактыўныя гульнёвыя пляцоўкі.

Па выніках Тыдня краязнаўства актыўныя ўдзельнікі мерапрыемстваў узнагароджваюцца Ганаровымі граматамі, а выпускнікам-экскурсаводам музея ўручаюцца Сертыфікаты экскурсаводаў Бердаўскага гісторыка-краязнаўчага народнага музея.

Дэталёва прадуманая навукова-даследчая работа музея ўстановы адукацыі дазваляе глыбей вывучаць і асэнсоўваць айчынную гісторыю і культуру, развіваць інтэлектуальныя, маральныя, культурныя і творчыя магчымасці вучняў і выхаванцаў, фарміраваць у іх нацыянальную самасвядомасць, далучаць да нацыянальнай і агульначалавечай культуры, удасканальваць адукацыйную работу ва ўстанове адукацыі, праводзіць вялікую культурна-асветніцкую працу.

Важным сродкам актывізацыі навукова-даследчай работы з’яўляецца напісанне вучнёўскіх даследчых работ, творчых сачыненняў, нататкаў і эсэ. У справаздачны перыяд вучнямі пад кіраўніцтвам педагогаў установы адукацыі на мясцовым матэрыяле праведзены, афармлены і прэзентаваны на розных узроўнях цікавыя даследаванні

| Краязнаўчыя даследаванні, праведзеныя на базе Бердаўскага гісторыка-краязнаўчага народнага музея ў перыяд з 2020 па 2022 гады | | | |
|---|---|---|---|
| Год | Назва даследавання | Пляцоўка прэзентацыі | Узнагароды |
| 2020 | “Мовы мамінай светлы выток…” (Колеранайменні ў анталогіі твораў лідскіх літаратараў пра беларускую мову “Шануйце роднае слова!”) (кіраўнік – Альшэўская Г.А., настаўнік беларускай мовы і літаратуры) | VIII адкрытая раённая канферэнцыя даследчых работ вучняў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі " Ступені да навукі» | |
| | “Адбітак родных з’яў у словах-вобразах…” (Адлюстраванне прыродных асаблівасцей роднага краю ў вершаваных творах Дануты Бічэль) (кіраўнік – Альшэўская Г.А., настаўнік беларускай мовы і літаратуры) | XVI адкрыты раённы конкурс даследчых работ (канферэнцыя) па вучэбных прадметах вучняў агульнай сярэдняй адукацыі "Крокі ў навуку - 2020» (г.Ваўкавыск) | Дыплом I ступені |

| | | | |
|---|---|---|---|
| 2021 | “ТОП-5: выбітныя людзі зямлі бердаўскай” (кіраўнік – Арлоўскі А.Г.) | Раённы этап VIII адкрытай абласной краязнаўчай навукова-практычнай канферэнцыі “Край Гарадзенскі” | Дыплом III ступені |
| 2022 | Алесь Нецеч з-пад вёскі Нецеч (кіраўнік – Альшэўская Г.А., настаўнік беларускай мовы і літаратуры) | IX адкрытая абласная краязнаўчая навукова-практычная канферэнцыя "Край Гарадзенскі" | Дыплом I ступені |
| | | X раённая канферэнцыя даследчых работ вучняў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі «Ступені да навукі» | Дыплом III ступені |
| | Лёс “маленькага чалавека” ў вялікай трагедыі беларускага народа (кіраўнік – Альшэўская Г.А., настаўнік беларускай мовы і літаратуры) | X раённая канферэнцыя даследчых работ вучняў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі «Ступені да навукі» | |
| | | Навукова-практычная канферэнцыя вучняў “Вялікая Айчынная вайна: гісторыя і памяць” | раённы этап – Дыплом I ступені; абласны – Дыплом I ст. |
| | Здымак з пакінутага фотаальбома, або Фотаздымак як крыніца пазнання роднага краю (кіраўнік – Альшэўская Г.А., настаўнік беларускай мовы і літаратуры) | Абласны этап Рэспубліканскага конкурсу “Экспанат для музея” Намінацыя «Таямніца ў рэчах» (рэчавы музейны прадмет) | Дыплом II ступені |

Краязнаўчая дзейнасць, у тым ліку даследчая, дазваляе нам не толькі папаўняць музейны фонд каштоўнымі знаходкамі і новымі інфармацыйнымі матэрыяламі. Яна спрыяе актыўнаму і ў высокай ступені выніковаму ўдзелу ў конкурсных мерапрыемствах краязнаўчага накірунку

| Інфармацыя аб удзеле прадстаўнікоў Бердаўскага гісторыка-краязнаўчага народнага музея ў конкурсных мерапрыемствах краязнаўчага накірунку ( 2020-2022) | | | |
|---|---|---|---|
| Год | Назва мерапрыемства | Форма ўдзелу | Вынік |
| 2020 | Грамадзянска-патрыятычны праект “Збяры Беларусь у сваім сэрцы” Рэспубліканскі конкурс “Падарожжа па малой Радзіме” | Відэапрэзентацыя экскурсійных маршрутаў “Сем цудаў бердаўскай зямлі” | Раённы этап – Дыплом I ступені, абласны этап – Дыплом III ступені |
| | Раённая віктарына “Этот день мы приближали как могли!” | Конкурсныя пытанні па 75-годдзю перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне, творчы матэрыял пра гераічныя подзвігі байцоў і камандзіраў савецкіх узброеных сіл | Грамата |

| | | | |
|---|---|---|---|
| | Грамадзянска-патрыятычны марафон прысвечаны прысвечаны 75-годдзю Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне “Это нужно – не мёртвым! Это надо – живым!” | Відэаролік “Памяць – у камені” | Сертыфікат |
| | Раённая фотавыстава “Лепшы кадр” | Фотаздымак у намінацыі “Мая малая Радзіма” | Дыплом II ступені |
| | II Адкрыты рэгіянальны конкурс турыстычных праектаў “Я запрашаю Вас на малую Радзіму” | Відэапрэзентацыя | Сертыфікат |
| | Рэспубліканская выстава-конкурс дзіцячай творчасці “Салют Перамогі – 75!” | Малюнак у намінацыі “Выяўленчае мастацтва!” (7 – 9 гадоў) | Раённы этап – Дыплом I ступені |
| | Раённы эколага-патрыятычны конкурс “Минувших лет живая память” | Творчая работа калектыву вучняў | Дыплом III ступені |
| | Рэспубліканская акцыя “Юнги Победы” | Намінацыя “Даследчая работа” | Раённы этап – Дыплом II ступені |
| | Рэспубліканскі фестываль-конкурс творчасці дзяцей і моладзі “Вянок славы”, прысвечаны 75-годдзю Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне | Творчая работа калектыву вучняў | Дыплом III ступені |
| 2021 | Абласны экскурсійна-пазнавальны праект з элементамі пачатковай тэхнічнай творчасці «С миру по нитке» | намінацыя “Майстар і чаляднік”: макет Храма Пакрова Прасвятой Багародзіцы ў вёсцы Мыто Лідскага раёна | Дыплом I ступені |
| | Рэспубліканская акцыя “Пісьмо ветэрану” | Пісьмо пагранічнікам 105-га пагранічнага палка | |
| | Рэспубліканскі конкурс “Радзіму праслаўляем – разам гуляем” | Эсэ “Закон жыцця” | Дыплом II ступені Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь; публікацыя ў газеце “Пераходны ўзрост” |
| | Рэспубліканскі культурна-патрыятычны кінамарафон “Глядзі і помні” , прысвечаны 80-годдзю пачатку Вялікай Айчыннай вайны | Відэаролік “А зори здесь тихие…” | II месца |

| | | | |
|---|---|---|---|
| | Рэспубліканскі конкурс творчых работ, прысвечаны Году народнага адзінства | Ручнік з вышыўкай “Вянок”;<br>малюнкі “Квітней, мая Беларусь сінявокая” і “Я люблю Ліду” | Сертыфікаты |
| | Раённы злёт юных краязнаўцаў | намінацыя “Знаходка года”: “Бразготкі, або шалестуны” | Дыплом II |
| | Музейны квэст-праект "Наследие Принеманья" | Паэтапныя анлайн-заданні | |
| | Абласны музейны віквіз “Чытаем гісторыю па елачных цацках” | Паэтапныя анлайн-заданні | Дыплом I ступені ў намінацыі “Лепшае творчае заданне-загадка “Дзіўнае побач” |
| | Раённая экспрэс-акцыя “Пісьмо памяці салдатам вайны ад нашчадкаў” | “Пісьмо нашчадка” | Сертыфікат пераможцы |
| | Раённая акцыя “Гадзіны Памяці” | пісьмовы ўрок-эсэ | II месца, раён |
| 2022 | Абласны экскурсійна-пазнавальны праект з элементамі пачатковай тэхнічнай творчасці «С миру по нитке» | Лялька ручной работы «Дзяўчына ў беларускім нацыянальным касцюме» | Дыплом I ступені |
| | Раённы Фестываль музеяў устаноў адукацыі | Выстава “Сэрцы, аддадзеныя людзям…”, прысвечаная Году гістарычнай памяці | Дыплом I ступені |
| | | Конкурс на лепшага экскурсавода ў намінацыі “Знаходка года” | Дыплом II ступені |
| | | “Музей у чамадане”: “Урокі Вялікай Айчыннай вайны, або Простыя рэчы салдацкіх будняў” | Дыплом II ступені<br>Агульнае – першае месца |
| | Рэспубліканская выстава-конкурс дзіцячай і маладзёжнай творчасці “Я родным краем ганаруся” | Намінацыя “Літаратурная творчасць” узроставай катэгорыі 11-13 гадоў, верш “Буслы” | Раённы этап – Дыплом II ступені, абласны этап – Дыплом I ступені, рэспубліканскі этап – Дыплом III ступені |
| | Дыстанцыйная анлайн-алімпіяда “Атамная памяць” у рамках рэспубліканскай дэкады грамадска-патрыятычных спраў “Чарнобыль. Захоўваючы памяць...” (Свіслацкі РЦТіК) | Вучнёўскі ўдзел. | Грамата за III месца |
| | | Удзел педагога | Грамата за III месца |

| | | | |
|---|---|---|---|
| | Раённы этап рэспубліканскага конкурсу эжкалагічных фотаздымкаў і малюнкаў "Ствараючы, на разбурай!" | Фота ў намінацыі "Экалагічны фотаздымак "Запаветны куток роднай прыроды" ва ўзроставай катэгорыі 14-16 год" | Грамата за І месца |
| | Рэспубліканскі адкрыты культурна-асветніцкі марафон "Час вымяраецца памяццю", прымеркаваны да Года гістарычнай памяці | намінацыя «Гістарычная прастора» – сацыяльны праект патрыятычнай накіраванасці «Памяць роднай зямлі»; намінацыя «Наша спадчына» – лялька ручной работы «Дзяўчына ў беларускім нацыянальным касцюме»; намінацыя «Гісторыя ў асобах» – нататка «Пакінуў след на зямлі» | Сертыфікаты |

Трэба адзначыыць, што ў дзейнасць настаўнікаў і выхавальнікаў установы адукацыі актыўна ўкараняецца музейная педагогіка. У адзіным адукацыйным працэсе яна становіцца ўсё больш звыклай у практыцы грамадзянскага і патрыятычнага, духоўна-маральнага, гісторыка-краязнаўчага выхавання асобы.

Акрамя традыцыйных экскурсій, у музеі арганізуюцца пазакласныя мерапрыемствы, школьныя святы і вечарыны, тэматычныя семінары і сустрэчы са знакамітымі людзьмі. У сістэму дзейнасці школьнага музея уваходзяць разнастайныя формы: падрыхтоўка тэкстаў тэматычных экскурсій і гутарак, паведамленняў да ўрокаў гісторыі, геаграфіі, беларускай і рускай літаратуры і выяўленчага мастацтва; правядзенне аглядных і тэматычных экскурсій, лекцый і гутарак, дзён адкрытых дзвярэй; апрацоўка і апісанне экспанатаў, якія паступаюць; падрыхтоўка музейных прадметаў для выязных выстаў і інш.

Асабліва запатрабаваным у справаздачным перыядзе сталі і адукацыйныя заняткі з выкарыстаннем музейных прадметаў ці цэлых экспазіцый. Музейна-адукацыйны ўрок адрозніваецца ад іншых форм работы музея з вучнямі методыкай правядзення. Ён арганізуецца з мэтай набыцця дадатковых ведаў па вучэбнай праграме (гісторыі, літаратуры, геаграфіі, выяўленчым мастацтве, музыцы, працоўным навучанні, АБЖ). Часта гэта – інтэграваны ўрок (мовы і гісторыі, музыкі і літаратуры і інш.).Трэба ад значыць, што музейна-адукацыйны ўрок – прыклад "маляўнічай" ілюстрацыі разнастайных падзей, у першую чаргу звязаных з гісторыяй і родным краем. На такім адрозным ад традыцыйнага ўроку эксклюзіўнае тое, што вучні спазнаюць музейны прадмет – знаёмяцца з экспанатамі з фонду музея і іх гісторыяй. Гуляючы, спаборнічаючы ў кемлівасці і знаходлівасці, адгадваюць загадкі, расшыфроўваюць рэбусы, адпраўляюцца разам з работнікамі музея і педагогам у падарожжа ў часе. Самі становяцца героямі нявыдуманых апавяданняў, да прыкладу, пра жыццё ў сялянскай хаце, пра правядзенне

ўрока ў дарэвалюцыйнай школе і г.д.. Акрамя таго, вучні не сядзяць за партамі, бо адна з нашых залаў абарудавана спецыяльна для правядзення такіх заняткаў – сталы расстаўлены ў коле, запланавана месца размяшчэння апаратуры для выкарыстання гукавых і відэафайлаў. Даступнае і цікавае тлумачэнне фактаў, з’яў і падзей выклікае непадробную цікавасць у слухачоў, што спрыяе хуткаму і якаснаму ўспрыманню неабходнага для перадачы матэрыялу.

Такім чынам, музей цесна звязаны з адукацыйным працэсам установы адукацыі, асноўная яго дзейнасць накіравана на фарміраванне даследчых навыкаў вучняў, на развіццё і ўдасканаленне ў іх камунікатыўных кампетэнцый і творчых здольнасцей.

У адукацыйным працэсе Бердаўскай базавай школы шырока выкарыстоўваюцца інавацыйныя і інтэрактыўныя формы і метады музейнай работы: урокі-экскурсіі, вандроўкі, вахты памяці, круглыя сталы, майстар-класы, мультымедыйныя ўрокі, ролевыя гульні, квэсты, тэматычныя дні, дэбаты, ток-шоу, вусныя часопісы, гадзіны зносінаў, экспедыцыі, кірмашы, выставы, віктарыны, урокі духоўнасці. У шосты школьны дзень (“школьную суботу”)  Саветам музея практыкуюцца такія формы, як тэматычныя вячоркі, адкрытая экскурсія “Гісторыя аднаго прадмета”, круглы стол “Дыялог пакаленняў”, урок памяці, вечар-партрэт знакамітага земляка, краязнаўчае падарожжа па бердаўскіх ваколіцах.

Так, вялікая колькасць урокаў гісторыі Беларусі і геаграфіі ў V-IX класах праводзіцца ў музеі або з выкарыстаннем матэрыялаў музея настаўнікам Арлоўскім А. Г. Настаўнік беларускай мовы і літаратуры Альшэўская Г. А. праводзіць тэматычныя музейныя ўрокі па прадмеце, гісторыка-літаратурныя віктарыны, літаратурна-музычныя кампазіцыі, калектыўныя творчыя справы, у супрацоўніцтве з калегамі-прадметнікамі ладзіць фальклорна-абрадавыя святы, інтэрактыўныя гульні. Настаўнікі пачатковых класаў Сініцкая Т. А., Барташэвіч А. П., Пальчукевіч З. І. і Горбач А. І., удала выкарыстоўваючы матэрыялы музея, часта праводзяць тут урокі чытання, урокі па тэмах “Наш край” па прадмеце “Мая Радзіма – Беларусь”. Настаўнік біялогіі Каламіец М. П. практыкуе свае прадметныя ўрокі ў музейных залах, у прыватнасці з выкарыстаннем экспазіцыі “Флора і фаўна нашага краю”. Выхавацелі дзіцячага сада праводзяць заняткі з выкарыстаннем экспазіцыі “Жыццё і побыт селяніна ў канцы XIX-пачатку XX ст.” з мэтай набліжэння будучых школьнікаў да народнай культуры роднага краю і бацькоўскай спадчыны.

Класнымі кіраўнікамі на базе музея праводзяцца выхаваўчыя мерапрыемствы, класныя і інфармацыйныя гадзіны грамадзянскага і патрыятычнага накірунку, заняткі ў рамках праекта “Школа Актыўнага Грамадзяніна” (напрыклад, Арлоўскім А.Г. ў IX класе пры вывучэнні Вялікай Айчыннай вайны савецкага народа ў кантэксце Другой сусветнай вайны, Альшэўскай Г.А. “Погляд нераўнадушнага грамадзяніна” і інш.), згодна з планам тут праводзяцца тэматычныя зборы піянерскай дружыны імя Ніны Качан.

Ва ўстанове адукацыі праводзяцца конкурсы па этнаграфіі краю, па гісторыі вёскі, гісторыі калгаса, установы адукацыі. Арганізоўваюцца фальклорна-абрадавыя святы ”Калядкі”, ”Вячоркі”.

Актыўна ўваходзіць у практыку музея праектная дзейнасць. У пачатку навучальнага года кожны клас атрымлівае заданне ў межах тэматычнага праекта, які рэалізуецца ў пэўны адрэзак часу. Сабраныя і афармленыя матэрыялы затым перадаюцца ў музей. Напрыклад, у справаздачным перыядзе намі былі паспяхова рэалізаваны адукацыйныя праекты краязнаўчай накіраванасці: практыка-арыентаваны экалагічны праект “Крыніцы нашай чысціня – агульны клопат бердаўчан штодня” (2021), сацыяльны праект патрыятычнай накіраванасці “Памяць роднай зямлі”, прымеркаваны да Года гістарычнай памяці (2022).

У межах раённага эколага-патрыятычнага праекта “Водар зямлі беларускай” прынялі ўдзел у пасадцы пладовага саду “Адукацыя Лідчыны – роднай зямлі” (2020). Дадзены ўдзел адзначаны іменным сертыфікатам і Падзячным пісьмом Старшыні Лідскай раённай арганізацыі РГА “Белая Русь”.

У межах святкавання 700-годдзя горада Ліды распрацаваны для рэалізацыі ў 2023 годзе сацыяльны праект “Фестываль беларускай калыханкі «Матуліна песня»”. Ён накіраваны на духоўна-маральнае выхаванне дзяцей і моладзі, прынянце імі пачуцця патрыятызму і грамадзянскай адказнасці, на развіццё культурна-пазнавальнага накірунку турызму.

У студзені 2023 года рэалізаваны праект “Памяць роднай зямлі” і распрацаваны “Фестываль беларускай калыханкі «Матуліна песня»” прадстаўлены да ўдзелу ў раённым конкурсе моладзевых праектаў “Ліда – 2023” і рашэннем журы прызнаны пераможцамі (Грамата за І месца).

У перспектыве – работа над праектам “Экалагічная сцежка «Блакітная стужка Бердаўкі» (водныя аб’екты малой радзімы)” і фестываль-конкурс дваровых гульняў нашых бабуль і дзядуль.

Вынікі праектнай дзейнасці адлюстроўваюцца ў завершаных даследчых работах, у зменных тэматычных выставах, выкарыстоўваюцца пры распрацоўцы і правядзенні інтэрактыўных заняткаў, майстар-класаў, дэсантаў па добраўпарадкаванню парка пры палацы і іншыя значныя справы. Рыхтуюцца да выдання брашуры з рабочым назвамі “Адраджаем традыцыі: мясцовая кухня” і “Гэта песенька матулі…”

Дзейнасць музея ўжо даўно выйшла далёка за сцены установы адукацыі. Актыў музея праводзіць змястоўную культурна-асветніцкую працу не толькі ў сваёй вёсцы, але і ў рэгіёне. Частымі наведвальнікамі музея бываюць як вучні і выхаванцы ўстаноў адукацыі горада і раёна, так і дарослыя з розных рэгіёнаў рэспублікі і замежных краін.

Найбольш запамінальнымі мерапрыемствамі, праведзенымі ў справаздачны перыяд, сталі наступныя:

- урок мужнасці “Далёкае рэха афганскай вайны” з удзелам воіна-інтэрнацыяналіста Сухалета Рамана Вікенцьевіча;

- Дзень духоўнасці “Ад сэрца да сэрца” з удзелам ветэрана педагагічнай працы, ганаровага піянера, былой загадчыцы Бердаўскага дзіцячага сада Кісялёвай Вольгі Міхайлаўны;
- круглы стол (“сустрэча пакаленняў”) з элементамі трэнінгавага занятка з удзелам шматдзетнай маці, мясцовай майстрыхі Сенькавец Надзеі Уладзіміраўны “Я і Сям’я. Сямейныя каштоўнасці”;
- сяброўская сустрэча юных экскурсаводаў з навучэнцамі Лідскага каледжа УА “Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы” “Добрым людзям усе мы рады!”;
- выставы “Хатні музей ў чамадане”, “Любімыя цацкі маіх бабулі і матулі”; “Сямейная рэліквія”; “Аб чым гавораць старыя паштоўкі”; сямейных альбомаў, у якіх знайшлі адлюстраванне гісторыя сям’і, прадстаўленая ў фотаздымках, зробленых у 1950-1980-я гг. XX ст.; бытавых рэчаў, адзення, прадметаў хатняга ўжытку, кніг, грампласцінак, значкоў і інш.;
- майстар-класы па фарбаванні драўляных яек, па вырабу сувеніраў з гліны;
- акцыя “Ад сэрца да сэрца” з удзелам выхаванцаў Дзіцячага дома сямейнага тыпу № 2 г.Ліды;
- “Вечарына ў Музеі сям’і” з удзелам старэйшых мясцовых жыхарак і майстар-класам па побытавых танцах;
- гульнёвая праграма “Сямейны падворак” з удзелам законных прадстаўнікоў;
- закладка Алеі гістарычнай памяці ля брацкай магілы ў парку вёскі Бердаўкі;
- адкрыццё новай музейнай экспазіцыі “Адданыя роднай зямлі…”

На базе музея праводзяцца школьныя, раённыя і абласныя семінары краязнаўчага накірунку, па адукацыйнай і музейнай дзейнасці. У перыяд 2020-2022 гг. адбыліся наступныя мерапрыемствы:
- раённая школа кіравання “Дзейнасць установы агульнай сярэдняй адукацыі рэалізуючай праграму дашкольнай адукацыі” па забеспячэнні якасці адукацыі (лістапад 2022).

Папулярызацыя дзейнасці Бердаўскага гісторыка-краязнаўчага народнага музея і багацця яго фондаў пастаянна адбываецца і ў працэсе наведвання ўстановы адукацыі прадстаўнікамі розных узроўняў грамадства.

Краязнаўчая, пошукавая, праектная і навукова-даследчая дзейнасць актыва музея знайшла адлюстраванне ў 13 артыкулах і тэматычных публікацыях у рэспубліканскіх і расійскіх выданнях. Афармлены дзве метадычныя брашуры – “Ад мінулага праз сучаснасць – у будучыню” (Выхаванне падрастаючага пакалення праз шматаспектую краязнаўчую даследчую дзейнасць) і “Як рэалізаваць сацыяльны праект патрыятычнай накіраванасці ва ўмовах сучаснай установы адукацыі?” (Грамадзянскае і патрыятычнае выхаванне дзяцей і моладзі сродкамі турысцка-краязнаўчай дзейнасці).

Дзейнасць калектыву педагогаў і вучняў, актывістаў музея за апошнія пяць гадоў неаднаразова прэзентавалася на раённым, абласным і міжнародным узроўні, дзе адзначалася таксама і ўзнагародамі.

| Пляцоўкі прэзентацыі дзейнасці Бердаўскага гісторыка-краязнаўчага народнага музея | | | |
|---|---|---|---|
| Год | Форма прадстаўлення | Пляцоўка прэзентацыі | Заўвагі |
| 2020 | Артыкул “Литературно-краеведческая исследовательская деятельность как эффективный путь к воспитанию успешной личности” | Маскоўская міжнародная канферэнцыя вышэйшага педагагічнага майстэрства | Завочны ўдзел з публікацыяй матэрыялаў у зборніку канферэнцыі; Диплом за высокий профессионализм и педагогическое мастерство коллектива |
| | Рэспубліканскі конкурс музеяў устаноў адукацыі “Во славу общей победы”, прысвечаны 75-годдзю перамогі ў Вялікай Айчынна вайны | Віртуальная экскурсія па экспазіцыі музея ўстановы адукацыі (Крупа А. Л.) | Дыплом III ступені |
| 2021 | Інтэрактыўная прэзентацыя музейнай экспазіцыі “Сялянскі побыт і штодзённы клопат” | Інтэрактыўная пляцоўка «Залатыя россыпы мінуўшчыны» ў рамках заключных мерапрыемстваў Рэспубліканскага Тыдня дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі ў Гродзенскай вобласці | |
| | Прэзентацыя вопыту ў рэжыме Zoom “Магчымасці анлайн-сервісаў у рабоце кіраўніка даследчага краязнаўства” | Практыкум «Стварэнне якаснага кантэнту для дыстанцыйнай формы краязнаўчай даследчай работы” для адказных за краязнаўчую работу (ЛРЦТіКНМ) | |
| | Музейна-адукацыйны занятак “Спяваецца там, дзе і воля, і холя, і доля” (лірычныя помнікі Вялікай Айчыннай вайны) – намінацыя “Творчыя знаходкі ў музеі” | Раённы этап рэспубліканскага конкурсу “Лепшая распрацоўка музейнага занятку” | |
| | Музейная развіваючая гульня “Этнаграфічнае лата” – намінацыя “Музейная гульня” | | Дыплом I ступені |

| | | | |
|---|---|---|---|
| | Анлайн-выступленне ў дзелавой праграме “Музейна-адукацыйны ўрок у школьным музеі як сродак рознабаковага развіцця сучаснага школьніка” | Рэспубліканскі форум музеяў устаноў адукацыі “Память народа в надежных руках молодых” | Дыплом РЦЭіК у намінацыі “Лепшы музейны адукацыйны праект”; публікацыя даклада ў электронным зборніку “Память народа в надежных руках молодых: материалы республиканского форума музеев учреждений образования |
| 2022 | Даклад “Фарміраванне асноўных кампетэнцый вучняў на ўроках беларускай мовы і літаратуры сродкамі музейнай педагогікі” | Рэспубліканская навуковая канферэнцыя «Актуальныя праблемы гуманітарнай адукацыі» | |
| | Спікерскае выступленне і артыкул для публікацыі “Исторические исследования как средство познания своих истоков и воспитания гражданина-патриота” (з вопыту работы Бердаўскага гісторыка-краязнаўчага народнага музея) | Усерасійская з міжнародным удзелам навукова-практычная канферэнцыя, прысвечаная перспектывам развіцця дзіцяча-юнацкага турызму і краязнаўства «Колпинские чтения по краеведению и туризму» | сертыфікат удзельніка; іменны сертыфікат (за спікерства); Дыплом II ступені за лепшы артыкул ў зборніку матэрыялаў канферэнцыі (намінацыя «Маршрутамі інавацыйнага пошуку») |
| | Даклад “Праектная дзейнасць у музеі ўстановы адукацыі. Рэалізацыя сацыяльнага праекта патрыятычнага напрамку “Памяць роднай зямлі” ў Лідскім раёне: мэты, задачы, перспектывы” | Семінар-практыкум для кіраўнікоў музеяў УА Лідскага раёна “Папулярызацыя дзейнасці музея УА ў сетцы Інтэрнэт з уключэннем практычных практыкаванняў…” | |
| | | Метадычнае аб’яднанне класных кіраўнікоў “Фарміраванне краязнаўчай кампетэнцыі вучняў праз арганізацыю праектна-даследчай дзейнасці” | |

| | | | |
|---|---|---|---|
| | Прэзентацыя вопыту работы Бердаўскага гісторыка-краязнаўчага народнага музея “Формы інтэрактыўнай работы як сродак удасканалення культурна-адукацыйнай дзейнасці музея ўстановы адукацыі” | Раённы этап акцыі «Эстафета музейнага вопыту» | Дыплом II ступені |
| | Сацыяльны праект патрыятычнай накіраванасці “Памяць роднай зямлі” | Раённы конкурс дзіцячых і маладзёжных ініцыятыў і сацыяльных праектаў «Дзейнічаем разам» | Дыплом III ступені |
| | | Рэспубліканскі конкурс метадычных матэрыялаў «Навучаем. Прасоўваем. Дзейнічаем» | |
| | | Раённы конкурс моладзевых праектаў “Ліда-2023” (намінацыя “Мая Лідчына. мая гісторыя”) | Грамата за I месца |
| | Відэаролік “Бердаўскі гісторыка-кразнаўчы народны музей” | Панорама педагагічнага вопыту «Грамадзянска-патрыятычнае выхаванне моладзі: спалучэнне рэальнага і віртуальнага ў дзейнасці музеяў» для кіраўнікоў музеяў устаноў адукацыі | |
| | Даклад “Музей установы адукацыі як цэнтр вывучэння роднага краю і захавання вобраза «малой Радзімы» ў свядомасці маладога пакалення (з вопыту работы Бердаўскага гісторыка-краязнаўчага народнага музея ў Год гістарычнай памяці)” | Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя “Установа дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі як адзін з найважнейшых інстытутаў духоўна-маральнага і патрыятычнага выхавання” (РЦЭіК) | |
| | | IV абласная навукова-практычная канферэнцыя “Духоўна-маральныя асновы грамадзянска-патрыятычнага выхавання сучаснай моладзі” | |
| | Выязная выстава “Адданыя роднай зямлі…”, прысвечаная памяці педагогаў Крупы А. Л. і Крупы Н. Ф. | Музейна-краязнаўчая галерэя “Вехі гісторыі роднага краю” ў рамках Жнівеньскай нарады педагагічных работнікаў устаноў адукацыі Лідскага раёна | |

| | | | |
|---|---|---|---|
| 2023 | Як рэалізаваць сацыяльны праект патрыятычнай накіраванасці ва ўмовах сучаснай установы адукацыі? (Грамадзянскае і патрыятычнае выхаванне дзяцей і моладзі сродкамі турысцка-краязнаўчай дзейнасці) | Раённы этап рэспубліканскай выставы-конкурсу навукова-метадычных матэрыялаў і педагагічнага вопыту па грамадзянска-патрыятычным выхаванні дзяцей і моладзі сродкамі эколага-біялагічнай, турысцка-краязнаўчай, ваенна-патрыятычнай дзейнасці «Будучыня пачынаецца сёння» | |

Вопыт дзейнасці Бердаўскага гісторыка-краязнаўчага народнага музея, прэзентаваны на пляцоўках рознага ўзроўню ў справаздачны перыяд, асвятляўся таксама ў СМІ

| Пляцоўкі прэзентацыі вопыту арганізацыі дзейнасці Бердаўскага гісторыка-краязнаўчага народнага музея, асветленыя ў сродках масавай інфармацыі ў перыяд 2020-2022 гг. | | | |
|---|---|---|---|
| Дата | Назва мерапрыемства/ падзея | Форма ўдзелу, удзельнік | Асвятленне ў СМІ (Інтэрнэт-рэсурс) |
| 10.04. 2021 | Рэалізацыя практыка-арыентаванага экалагічнага праекта “Крыніцы нашай чысціня – агульны клопат бердаўчан штодня” | Нататка “Жыві, крынічка” (Альшэўская Г. А.) | “Лідская газета” |
| 19.05. 2021 | Рэканструкцыя мясцовага абрада “Засеўкі” | Нататка “Благаславеннае зерне”, або Як у Бердаўскай школе па-бацькоўску сеялі (Альшэўская Г. А.) | “Лідская газета” |
| 15.09 .2021 | Інтэрактыўная пляцоўка «Залатыя россыпы мінуўшчыны» ў рамках заключных мерапрыемстваў Рэспубліканскага Тыдня дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі ў Гродзенскай вобласці (10.09.2021) | Інтэрактыўная прэзентацыя музейнай экспазіцыі “Сялянскі побыт і штодзённы клопат” | Итоги республиканской недели дополнительного образования детей и молодёжи (https://edu-grodno.gov.by/ новости/document-32723. html) |
| 23.06. 2022 | Адкрыццё музейнай экспазіцыі “Адданыя роднай зямлі…” | Выступілі ў якасці стваральнікаў экспазіцыі і арганізатараў урачыстага мерапрыемства | “Лідская газета” В. Капцэвіч. Артыкул “У Бердаўскім гісторыка-краязнаўчым народным музеі падзея: адкрыта экспазіцыя памяці Анатоля Крупы” (http://lidanews.by/news/li fe/26103news.html?sphras e_id=40693) |

| | | | |
|---|---|---|---|
| 14.07. 2022 | Наведванне Бердаўкі сваякамі воіна, пахаванага ў брацкай магіле ў мясцовым парку | Артыкул “Шлях на 1350 кіламетраў і 16 гадзін за рулём. Яўген Голубеў разам са сваёй сям’ёй прыехаў з Расіі, каб пакланіцца магіле дзеда” (Альшэўская Г. А.) | “Лідская газета” (http://lidanews.by/news/life/26291news.html) |
| 30.11. 22 | Раённая школа кіравання “Дзейнасць установы агульнай сярэдняй адукацыі рэалізуючай праграму дашкольнай адукацыі” па забеспячэнні якасці адукацыі | Занятак з выхаванцамі спецыяльнай групы для дзяцей з цяжкімі парушэннямі маўлення па тэме “У госці да цётачкі Ганны” (выхавацель Кандыба Т.І.) | “Лідская газета” Зверко А. Артыкул “Обсудили ключевые моменты дошкольного образования” (https://lidanews.by/news/life/27625news.html) |

Больш за 33 гады музей працуе на грамадскіх пачатках на даволі высокім арганізацыйным і навуковым узроўні ў навукова-асветніцкай, збіральніцкай, фондава-захаваўчай, папулярызатарскай і культурна-выхаваўчай рабоце.

У музеі вядзецца неабходная ўліковая дакументацыя: акты прыёму і выдачы музейных прадметаў, кнігі ўліку экспанатаў асноўнага і навукова-дапаможнага фондаў, кніга ўліку наведвальнікаў музея, кніга ўліку мерапрыемстваў, якія праходзяць на базе музея, справаздачы аб дзейнасці музея за каляндарны год. Створана картатэка, на найбольш каштоўныя прадметы заведзены навуковыя пашпарты, вядуцца вопісы прадметаў, якія ўзяты на ўлік дзяржаўным музеем. Распрацаваны і зацверджаны дырэктарам тэксты 14 экскурсій (для наведвальнікаў розных узроставых катэгорый; традыцыйных і інтэрактыўных), спісы пошукавых заданняў, кніга водгукаў наведвальнікаў музея.

Для захоўвання музейных прадметаў і музейных калекцый створаны належныя ўмовы, арганізаваны працэс іх камплектавання і ўліку, вядзецца навуковая інвентарызацыя музейных прадметаў і музейных калекцый у адпаведнасці з патрабаваннямі Інструкцыі аб парадку камплектавання музейных фондаў, унутрымузейнага ўліку, навуковай апрацоўкі і захоўвання музейных прадметаў і музейных калекцый, уключаных у Музейны фонд Рэспублікі Беларусь, навукова-дапаможных і сыравінных матэрыялаў.

Адміністрацыя ўстановы адукацыі і Савет музея будзе хадатайнічаць перад мясцовымі ўладамі, турыстычнымі арганізацыямі аб уключэнні Бердаўскага гісторыка-краязнаўчага народнага музея ў экскурсійныя маршруты.

Такім чынам, краязнаўства – гэта цудоўная школа выхавання грамадзянскасці і фарміравання асноў жыццёвага самавызначэння. Таму важна адзначыць, што музей у цэлым і музейная педагогіка ў прыватнасці з’яўляюцца неацэнным сродкам развіцця станоўчых эмоцый, эстэтычнага густу вучняў, яго пазнавальнай актыўнасці, узбагачаюць духоўны свет. Падчас супрацы ў музейным асяроддзі вучні атрымліваюць адказы на многія

пытанні, пашыраюць свае ўяўленні пра навакольны свет. А гэта значыць, педагогіка, дапоўненая музейнай дзейнасцю, дазваляе, як лічаць спецыялісты, “вырашаць асноўную педагагічную праблему, а менавіта: як навучыць дзяцей, каб выклікаць у іх цікавасць, жаданне вучыцца; развіць пачуццё любові да Радзімы, жаданне і імкненне вывучаць яе гісторыка-культурную спадчыну”, свае карані, свой род, далучацца праз музей да гісторыі роднага краю, горада, вёскі, сям’і. З дапамогай музейнай педагогікі вучні лепш сацыялізуюцца, у іх фарміруюцца якасці асобы высокамаральнага грамадзяніна, патрыёта сваёй Айчыны.

Кажуць, чалавека можна параўнаць з птахам, адно крыло якога – мінулае, другое – будучае. Калі не дзейнічае адно крыло, то птах губляе раўнавагу, арыентацыю ў часе і прасторы і непазбежна падае ў прорву бездухоўнасці. Калі ў чалавека няма патрыятычных пачуццяў, ён становіцца перакаці-полем ці ператвараецца ў засохлую траву - пералёт, якому ўсё роўна, што гіне: культура, памяць, зямля… Каб гэтага не адбылося, ужо трыццаць чацвёрты год у нашай установе адукацыі як жывы арганізм дзейнічае гісторыка-краязнаўчы музей. Музей, дзе сёння захоўваюцца закладзеныя нашымі папярэднікамі традыцыі, дзе набываюць заслужаную папулярнасць новыя формы работы і куды ахвотна прыходзілі, прыходзяць і будуць імкнуцца дзеці і дарослыя.

Дырэктар Бердаўскай
базавай школы Лідскага раёна С. Ф. Саўчык

Кіраўнік музея А. Г. Арлоўскі